# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА

УДК 792:004.738.5

*У. А. Трапянок*

## Інтэрнэт-тэатр і спосабы яго функцыянавання ў сучаснай медыяпрасторы

*Мэтай прапанаванага даследавання з’яўляецца выяўленне спосабаў функцыянавання інтэрнэт-тэатра. Аўтар прыводзіць азначэнне інтэрнэт-тэатра; аналізуе мастацкія і тэхнічныя вартасці спектакляў, якія транслююцца пры дапамозе Інтэрнэту. Разглядае асаблівасці функцыянавання тэатральнага мастацтва ў глабальнай сетцы.*

Камп’ютарная (дыгітальная) культура трывала ўвайшла ў паўсядзённае жыццё сучаснікаў. Інтэрнэт стаў абавязковым атрыбутам дзелавога чалавека, увайшоў у інструментарый прадстаўнікоў розных прафесій, заняткаў і прыхільнасцей, а таксама распаўсюдзіўся як папулярны сродак зносін і паўсядзённы спосаб баўлення вольнага часу сярод прадстаўнікоў розных пакаленняў. За кароткі перыяд Інтэрнэт зарэкамендаваў сябе не толькі як універсальная платформа для стварэння ўласных твораў мастацтва (net-art), але і захоўвання, трансфармацыі і рэтрансляцыі ўжо існуючых мастацкіх узораў. Глабальная камп’ютарная сетка, развіццё якой у канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. адбывалася надзвычай актыўна і маштабна, хутка стала прывабнай і для тэатральнага мастацтва.

Тэатральныя паказы, незалежна ад жанру і віду, якія карыстальнік «ужывае» з дапамогай глабальнай сеткі (аўдыяльны ці відэатвор: опера, балет, драма ў радыё-, тэлевізійным ці сцэнічным варыянце), яднае наяўнасць Інтэрнэту: ён з’яўляецца першапачатковай умовай, каб твор быў данесены да рэцыпіента. Тэатральнае мастацтва ў алічбаваным асяроддзі выходзіць за межы бытавання сцэнічнай прасторы і ўтварае «ўнікальны» прадукт са сваімі спосабамі трансляцыі. Гэта ўжо новы від функцыянавання тэатральнага мастацтва, які называюць інтэрнэт-тэатрам. Але гэты тэрмін пакуль не мае дастатковага навуковага абгрунтавання і асэнсавання. Паспрабуем акрэсліць асаблівасці інтэрнэт-тэатра.

Для вызначэння функцыянавання тэатра ў Інтэрнэце могуць быць прыдатныя паняцці «лічбавы тэатр» ці «электронны тэатр», але, як нам здаецца, яны не зусім дакладныя, не поўнасцю раскрываюць сут-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць інтэрнэт-тэатра. Сучасныя запісы тэатральных пастановак для трансляцыі на тэлебачанні таксама з'яўляюцца лічбавымі, паколькі створаны з дапамогай адпаведнага абсталявання ў лічбавым фармаце. Запісы на CD, DVD-дысках таксама лічбавыя, электронныя. І хоць «інтэрнэт-тэатр», сінанімічнае азначэнне якога «тэатр у Інтэрнэце», таксама мае на ўвазе алічбаваны стан тэатральнага прадукту, аднак утрымлівае ў сабе канкрэтны пасыл да спосабу яго трансляцыі, перадачы да рэцыпіентаў.

Тэлевізійны спектакль не з'яўляецца ўзорам інтэрнэт-тэатра да тае пары, пакуль не наладжана трансляцыя тэлеканала ў глабальнай сетцы і карыстальнік не ўбачыў твор. Тое самае і з радыётэатрам, або з запісанымі, алічбаванымі тэатральнымі работамі. Каб яны сталі прыкладамі інтэрнэт-тэатра, неабходна іх дадаць, запампаваць у Сусветную павуціну. З апісанага вынікае, што інтэрнэт-тэатр – гэта зборнае, універсальнае паняцце, якое ўвабрала ўсе тэатральныя жанры і віды, якія захоўваюцца ў Інтэрнэце і транслююцца з яго дапамогай. Такім чынам, *інтэрнэт-тэатр* – гэта від сучаснага тэатральнага мастацтва, які ў якасці асноўнага сродку трансляцыі выкарыстоўвае глабальную сетку Інтэрнэт. Інтэрнэт-тэатр выступае разнавіднасцю медыямастацтва, якое функцыянуе на аснове алічбаваных тэатральных узораў.

Перадача праз Інтэрнэт тэлевізійных і радыёспектакляў, інтэрнэт-пастановак, спецыяльна зробленых для трансляцыі ў камп'ютарным асяроддзі, застаецца ў першапачатковым выглядзе, без змен і адаптацый. Радыёспектаклі ствараюцца па законах аўдыяльнага ўспрымання, якія не залежаць і не змяняюцца ад спосабу трансляцыі. Тэлевізійныя драматычныя творы таксама не маюць спецыфічных патрабаванняў для перадачы праз Інтэрнэт: яны ствараюцца па правілах экранных мастацтваў, а перадача тэатральнага прадукту праз Інтэрнэт прадугледжвае наяўнасць экрана для ўспрымання. Не патрабуюць адаптацыі і інтэрнэт-спектаклі: прадукцыйныя (першасныя) узоры інтэрнэт-тэатра. Найбольшыя пераўтварэнні для трансляцыі ў Інтэрнэце праходзяць творы, пастаўленыя для паказу на сцэнічных пляцоўках. Пры ўмове прафесійнага запісу такія творы не страчваюць сваіх мастацкіх вартасцей, хаця губляюць тэатральнасць, прыпадабняюцца да кіна- і тэлевізійнага мастацтва. Функцыі, задачы інтэрнэт-тэатра застаюцца ідэнтычнымі з мастацтвам Мельпамены ў цэлым.

Інтэрнэт-тэатр з'яўляецца маладой мастацкай з'явай. Засваенне лічбавага асяроддзя прадстаўнікамі тэатральнай галіны пачалося ў пачатку XXI ст. Прэм'ерны паказ інтэрнэт-тэатра адбыўся ў 2000 г., калі французскі акцёр Я. Брэсан у рэжыме on-line разыгрываў п'есу «Мучанік». 15–22 кастрычніка 2004 г. адбыўся першы расійскі інтэрнэт-фестываль «Тэатральная павуціна». Арганізатары форуму ставілі перад сабой задачу адпрацаваць методыку жывой трансляцыі пастановак у сеціве. Для ўдзелу ў форуме былі запрошаны сем тэатраў, якія працавалі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з living рознымі жанрамі тэатральнага мастацтва. Здымкі спектакляў вяліся трыма камерамі. У кастрычніку 2010 г. у рунэце (рускамоўнай інтэрнэт-прасторы) на партале www.teatrtv.com спектаклем «Хуліган» з акцёрам С. Бязрукавым у галоўнай ролі адкрыўся першы інтэрнэт-тэатр Расіі «Свабодная пляцоўка» [3]. Арганізатары заяўлялі, што гэта некамерцыйны праект для стварэння запатрабаванага тэатральнага прадукту. Планаваліся таксама абмеркаванні з удзелам пастаноўшчыкаў, выканаўцаў і тэатразнаўцаў. На сёння партал www.teatrtv.com недаступны, адсутнічае інфармацыя пра іншыя паказы інтэрнэт-тэатра, праект спыніў існаванне.

Беларусь далучылася да прамых інтэрнэт-трансляцый у жніўні 2013 г.: удзельнік Эдынбургскага фестывалю «Свабодны тэатр» (г. Мінск) трансліраваў спектакль «Trash Coisine». У кастрычніку 2015 г. трупа Свабоднага тэатра прапанавала інтэрнэт-карыстальнікам фестываль з дзесяці п’ес, які трансліраваўся ў сеціве два тыдні і прысвячаўся 10-годдзю калектыву. У кастрычніку 2016 г. тэатр працягнуў on-line паказы трансляцыяй спектакля «Burning doors».

Характэрная асаблівасць падобных паказаў заключаецца ў анлайнавым спосабе трансляцыі: пабачыць спектаклі можна толькі падчас іх непасрэднай перадачы ў канкрэтна абмежаваны часавы прамежак. On-line паказы ажыццяўляюцца як і прамы радыё- ці тэлеэфір: карыстальнік Інтэрнэту, які своечасова не падключыўся да інтэрнэт-сайта, што ажыццяўляе on-line трансляцыі, пазбаўляецца магчымасці стаць сведкам паказу.

Прыкладаў on-line трансляцый у Беларусі і Расіі зафіксавана нямнога. Прафесійныя тэатральныя калектывы не спяшаюцца выкладваць для ўсеагульнага доступу прэм’ерныя работы, таму што па рэгламенце тэатральных фестываляў, у якіх можна паўдзельнічаць, спектаклі не павінны быць у шырокім доступе. Рэпертуарныя пастаноўкі таксама не прынята размяшчаць у сеціве, паколькі такім чынам можна пазбавіцца гледача ў зале і, як вынік, панесці матэрыяльныя страты. Зрэдку спектаклі, якія знаходзяцца ў ратацыі, можна ўбачыць падчас юбілейных урачыстасцей ці ў межах фестываляў мастацтваў у тэлеэфіры каналаў «Беларусь 3» (Беларусь) і «Культура» (Расія). Гэтыя творы робяцца даступнымі on-line, паколькі каналы вядуць вяшчанне ў сеціве. Дарэчы, у падобных выпадках інтэрнэт-трансляцыя мае некалькі пераваг перад тэлевізійнай: фінансавыя выдаткі на паказ у Сусветнай павуціне значна меншыя, з улікам агульнадаступнасці Інтэрнэту on-line перадача спектакляў у дзясяткі разоў павялічвае геаграфію гледачоў, садзейнічае абмену вопытам паміж прафесіяналамі [3].

Асобна вылучым яшчэ адну разнавіднасць інтэрнэт-трансляцыі, калі карыстальнік сеткі Інтэрнэт у любы зручны для яго час «загружае», запампоўвае выбраны алічбаваны запіс спектакля на свой гаджэт

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

для далейшага выкарыстання, або праглядае твор непасрэдна з рэсурсу, які ўтрымлівае той ці іншы запіс. Такі паказ з'яўляецца афлайнавым (off-line). Універсальнай, сусветна вядомай «базай» такіх відэазапісаў з'яўляецца партал www.youtube.com. Ён пастаянна папаўняецца, у тым ліку ўзорамі тэатральнага мастацтва. На гэтым сайце запампаваны і беларускія спектаклі, пастаўленыя ў розных тэатрах, пошук якіх ажыццяўляецца стандартна для ўсёй базы Інтэрнэту: праз адпаведны пошукавы радок, размешчаны на сайце, з пазначэннем назвы спектакля ці наймення тэатра. Відэапартал утрымлівае дзясяткі рэпрэзентатыўных спектакляў і фрагментаў пастановак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага рускага тэатра імя М. Горкага, Гродзенскага тэатра лялек і інш. Там жа можна ўбачыць работы непрафесійных драматычных труп, якія для дэманстрацыі, папулярызацыі ўласнай дзейнасці актыўна выкарыстоўваюць, апроч таго, сацыяльныя сеткі.

Вельмі шырока ў сеціве ў афлайнавым рэжыме рэпрэзентаваны пастаноўкі расійскіх тэатраў. Створаны дзясяткі сайтаў з сотнямі спектакляў, якія ўяўляюць сабой рэтраспектыву рускай тэатральнай школы ад моманту з'яўлення відэазапісу. Універсальны партал, які можна назваць алічбаваным архівам тэатральных пастановак, радыё- і тэлеспектакляў, балетных і оперных твораў, мае назву «Тэатраблог» (http://teatroblog.ru/spektakli-na-video). На партале захоўваюцца спектаклі дзясяткаў драматычных калектываў: Вялікага драматычнага тэатра імя Г. А. Таўстаногава, Малога тэатра, Майстэрні П. Фаменкі, Маладзёжнага тэатра на Фантанцы, Маскоўскага мастацкага тэатра імя А. Чэхава, Тэатра-студыі А. Табакова, тэатраў імя Я. Вахтангава, М. Ярмолавай, тэатра «Современник» і інш. Зручная навігацыя дазваляе за некалькі секунд перанесціся ў віртуальную тэатральную залу [3]. Немагчыма назваць дакладную колькасць сайтаў, на якіх запампаваны відэазапісы расійскіх тэатральных работ мінулых гадоў, паколькі Інтэрнэт дазваляе рабіць «перапосты», «перазакачкі» архіўных матэрыялаў на іншыя інтэрнэт-рэсурсы амаль без абмежаванняў. Афлайнавыя трансляцыі даступны бясплатна, часткова ці цалкам платна.

Пры анлайнавых і афлайнавых паказах спектакляў у Інтэрнэце губляецца «жывая» атмасфера, якая пануе ў глядзельнай зале, аднак рэжысёрскія задумы, праца мастака-сцэнографа, кампазітара, акцёрская ігра застаюцца навідавоку, уздзейнічаюць на інтэрнэт-гледача. Калі спектакль запісваецца з некалькіх ракурсаў (агульны план, зблізку, збоку), у рэпрэзентатыўным выглядзе гэта надае твору больш выйгрышны варыянт, робіць тэатральную пастаноўку падобнай да кінастужкі ці тэлеспектакля. Хаця пры няўдалых здымках часам можа страчвацца агульная карціна дзеяння ці важныя буйныя планы выканаўцаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Два спосабы рэпрэзентацыі тэатральнага мастацтва спалучыў новы праект, які з'яўляецца яскравым прыкладам сучаснага інтэрнэт-тэатра і які развівае яго. Праект, ініцыяваны ў 2006 г. тэатрам Метраполітэн-опера (ЗША), атрымаў найменне The Met: Live in HD [4]. Ён выйшаў за прасторы «інтымнай» трансляцыі на экране камп'ютара, выкарыстоўваючы для паказаў экраны кінатэатраў. Праект закліканы прапагандаваць тэатральнае мастацтва ва ўсім свеце, дзякуючы трансляцыі высокай якасці праз Інтэрнэт і паказу ў кінатэатрах. Ідэя належала Пітэру Гелбу, які ў 2006 г. заняў пасаду генеральнага менеджара тэатра. Задачамі праекта сталі павышэнне папулярнасці тэатра Метраполітэн-опера, скарачэнне дэфіцыту бюджэту ўстановы праз далучэнне да опернага мастацтва новых слухачоў, асабліва моладзі, а таксама магчымасць убачыць пастаноўкі гледачам з іншых населеных пунктаў ЗША і планеты з дапамогай інтэрнэт-перадачы.

Першай у межах праекта трансліравалі оперу В. А. Моцарта «Чароўная флейта» ў 98 кінатэатрах ЗША, Вялікабрытаніі, Японіі і Нарвегіі. Праект імгненна выйшаў на міжнародную арэну. Да яго адразу далучыліся Бельгія, Францыя, Германія, Італія, Іспанія [7; 8]. У сакавіку 2007 г. адбыўся паказ оперы «Севільскі цырульнік» Дж. Расіні, які сабраў 60 тысяч гледачоў па ўсім свеце. Ніводны тэатр не мае падобных па памерах залаў, здольных адначасова размясціць такую колькасць гледачоў. У адным з інтэрв'ю П. Гелб адзначыў, што спектаклі на кінаэкранах становяцца каталізатарамі для спевакоў: «Нашы зоркі разумеюць, што іх слухае ўвесь свет, і гэта падштурхоўвае іх праявіць усё сваё майстэрства і сыграць, сапраўды, вялікія спектаклі» [2]. У сезоне 2007/08 г. да сеткі прамых трансляцый тэатра Метраполітэн-опера далучыліся гледачы ў Аўстраліі, Аўстрыі, Чэхіі, Венгрыі, Латвіі, Літве, Люксембургу, Нідэрландах, Польшчы, Новай Зеландыі, Аргенціне, Пуэрта-Рыка [7]. У Расіі паказы спектакляў сусветна вядомых тэатраў пачаліся ў кастрычніку 2010 г. [1]. У расійскіх афішах значацца оперы, балеты, драматычныя спектаклі, фільмы-выставы. Назва праекта змянілася на TheatreHD. Расійскаму гледачу сталі даступны спектаклі Каралеўскага нацыянальнага тэатра і Шэкспіраўскага тэатра «Глобус» (г. Лондан), Каралеўскай Шэкспіраўскай кампаніі (г. Стратфард-на Эйване), Метраполітэн-опера (г. Нью-Ёрк), Вялікага тэатра (г. Масква) і інш. Тэатры і аб'яднанні, зацікаўленыя ў падобных трансляцыях, выдаткоўваюць фінансы для прамых трансляцый ці запісаў, тым самым не толькі дэманструюць высокі выканальніцкі ўзровень, але і папулярызуюць тэатральнае мастацтва сваёй краіны, робяць яго шырока даступным. На сёння TheatreHD яднае дзясяткі кінатэатраў Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана і Беларусі [2].

Наша краіна далучылася да праекта TheatreHD у кастрычніку 2015 г. Для беларускай публікі першай паказалі оперу «Трубадур», галоўныя партыі ў якой выканалі расійскія спевакі з сусветнымі імёнамі Г. Нятрэбка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Д. Хварастоўскі. Затым мінская публіка пазнаёмілася з творчасцю артыстаў з розных краін, якія працуюць у драматычным і музычным тэатры – Б. Камбербэтча, Х. Мірэн, Р. Файнса, Т. Хідлстана, Дж. Дэнч, С. Захаравай, У. Лантратава і інш. [5]. Першы паказ у Мінску прайшоў з аншлагам, таму можна зрабіць высновы, што публіка, пазбаўленая магчымасці праз тэлевізійныя каналы далучацца да сусветных узораў сучаснага тэатральнага мастацтва, чакала падобных паказаў, а значыць, інтэрнэт-тэатр у нашай краіне, як і ва ўсім свеце, – з'ява перспектыўная. Працэсу прыцягнення да трансляцый оперы і драмы ў кінатэатрах спрыяе пераклад тэкстаў (сінхронны ці ў выглядзе субцітраў), які суправаджае сеансы. Публіка не толькі заўважае тонкасці акцёрскага выканання, але і ўспрымае тэкставы матэрыял з рэжысёрскімі рэмаркамі і перапрацоўкамі.

Жанравая палітра беларускіх паказаў у межах TheatreHD – оперы, балеты, драмы, фільмы-выставы. Праект пашырае свае межы на тэрыторыі Беларусі. Калі першы паказ адбыўся ў дзяржаўным кінатэатры «Цэнтральны» (г. Мінск), цяпер трансляцыі арганізуюць кінатэатры сталічнай прыватнай сеткі Silver Screen, дзяржаўныя кінатэатры Гомеля і Віцебска [5]. Колькасць паказаў за месяц змяняецца, пра што сведчыць пералік трансляцый, заяўленых на восень 2016 г. У кастрычніку значылася 5 работ – 3 драматычныя спектаклі, опера і балет; у лістападзе – 4 паказы. Багацей аказалася афіша верасня: 12 паказаў. Гэта 4 драматычныя спектаклі («Доктар Фаўст», «Рычард III», «Венецыянскі купец», «Дванаццатая ноч»), 2 балеты («Мэцью Борн: Спячая прыгажуня», «Мэцью Борн: Кармэн»), 4 фільмы-выставы («Рэмбрант», «Імпрэсіяністы», «Вінсент Ван Гон: новы погляд», «Мунк – 150») і два дакументальныя фільмы «Вермеер і музыка», «Манэ: жыццё на палатне HD» [6].

Прааналізуем мастацкія і тэхнічныя якасці тэатральных паказаў праекта TheatreHD, вызначым іх адрозненні і падабенства з іншымі экраннымі трансляцыямі драмы на прыкладзе спектакля «Рычард III», пастаўленага тэатрам «Алмейда» (г. Лондан) па п'есе У. Шэкспіра. П'есы адаптуюцца і перапрацоўваюцца. У спектаклі «Рычард III» класічны матэрыял у рэжысёрскім прачытанні Р. Гулда набыў «жывое гучанне» праз увядзенне ў спектакль атрыбутаў сучаснага чалавека: мабільнага тэлефона, дзелавых касцюмаў, узгадвання пра паркоўкі, фрагментаў тэлевізійнага інтэрв'ю і інш. Зразумелы сённяшняму гледачу змест п'есы, які паказвае далёка не гуманныя чалавечыя ўзаемаадносіны на палітычным полі гарбатага караля, які шляхам падману, ілжы, папулізму і забойстваў дабіваецца крэсла кіраўніка краіны. Як адзначыў у паказаным перад спектаклем інтэрв'ю рэжысёр Р. Гулд, пастаноўка своечасовая, калі ўлічваць працэсы, якія перажывае Еўропа ў XXI ст. Інтрыгі, хітрыкі, падманныя шляхі дасягнення мэты, апісаныя У. Шэкспірам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у п’есе, характэрныя для побытавых узаемаадносін большасці людзей, а значыць, тэатральны матэрыял з’яўляецца актуальным, ён пашырыў межы бытавання праблемнага поля, узнятага драматургам, у дачыненні да любога сучаснага чалавека. Мізансцэны, узаемаадносіны герояў, характары, акцёрскі падбор, рэквізіт у спектаклі «Рычард III» прадуманы дасканала. Выдатна раскрыты супярэчлівы, непастаянны, жорсткі і часам наіўны характар галоўнага героя Рычарда III, ролю якога сыграў Р. Файнс. На экране мы бачым героя, які сумяшчае зладзейства і непасрэднасць, нязломную сілу і слабасць, бушуючыя эмоцыі і ўнутраную стомленасць. Гэта роля, якая патрабуе высокага акцёрскага таленту і майстэрства, у Р. Файнса ўдалася. Дзякуючы чаргаванню буйных і агульных планаў, гледачы заўважаюць нават самыя нязначныя мімічныя змены выканаўцаў, якія апярэджваюць далейшую змену ў настроі і фізічных дзеяннях артыстаў. Але не заўсёды чаргаванне планаў дапамагае адчуць драматызм сітуацыі: у дыялогах, напрыклад, першага дзеяння яно замінае гледачу, перашкаджае мільгаценнем кадраў, тым самым змяншаючы эмацыянальную нагрузку сцэны. У тэатры такі пабочны эфект, характэрны для здымачнага працэсу, адсутнічае, паколькі глядач успрымае агульную карціну. Разам з тым камера выхоплівае і набліжае да гледача ў кіназале дробныя элементы (напрыклад, рух на твары, някідкія элементы сцэнічнага касцюма, бутафорыю); праз чаргаванне кадраў падзяляе сцэнічную прастору на некалькі асобных пляцовак (у тэатры гэта адбываецца за кошт змены святла і дэкарацый), і такім чынам збірае ўвагу гледача, дае яму магчымасць «перамяшчацца» ў прасторы, не стамляцца аднастайнасцю.

Апісаныя вышэй тэхнічныя прыёмы, універсальныя для паказу оперы, балета ці драматычнага спектакля, з’яўляюцца характэрнымі для мастацтваў, што ствараюцца з выкарыстаннем камеры, – тэлевізійнага і кінематаграфічнага. Адсюль вынікае, што праект TheatreHD – гэта, перш за ўсё, спалучэнне выразных сродкаў экранных мастацтваў. Можна правесці прамыя паралелі з тэлевізійнымі спектаклямі – правобразамі сучасных тэатральных трансляцый TheatreHD. Да іх далучыліся сучасныя медыятэхналогіі – перадача праз Інтэрнэт і дэманстрацыя на вялікім экране з дапамогай лічбавага кінаабсталявання, адчувальнага да гуку і відэашэрагу найвышэйшай якасці. У выніку з’явіўся новы мультымедыйны праект маштабнага распаўсюджвання інтэрнэт-тэатра, здольны адначасова яднаць мільёны гледачоў у кіназалах і даносіць высокапрафесійныя ўзоры сучаснага тэатра ў аддаленыя ад месца выканання населеныя пункты.

Такім чынам, са з’яўленнем Інтэрнэту з 1990-х гг. тэатральнае мастацтва пачало засвойваць новыя спосабы функцыянавання і распаўсюджанасці. Спектаклі, незалежна ад жанраў і відаў, перадача якіх ажыццяўляецца з дапамогай глабальнай сеткі, яднае паняцце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«інтэрнэт-тэатр». Інтэрнэт-тэатр мае разгалінаваную структуру, якая ахоплівае тэатральныя паказы, запісаныя для трансляцыі праз Інтэрнэт, тэлевізійныя пастаноўкі, радыё- і аўдыяспектаклі, адмысловыя інтэрнэт-спектаклі, прызначаныя для непасрэднай трансляцыі ў глабальнай сетцы, і г. д. Некаторыя з іх відазмяняюцца, іншыя застаюцца ў першапачатковым выглядзе. Усіх іх яднае адзіная, галоўная ўмова бытавання – наяўнасць Інтэрнэту, які робіцца праваднікам мастацкіх твораў да рэцыпіентаў.

Спектаклі іграюцца ў рэжыме рэальнага часу, калі глядач здольны далучыцца да паказу ў вызначаны тэрмін. Гэта анлайнавы спосаб трансляцыі. Работы, што запісваюцца і запампоўваюцца, «архівіруюцца» ў глабальнай павуціне з доступам да карыстальнікаў у любы час, адносяцца да афлайнавага спосабу трансляцыі. База афлайнавых паказаў пастаянна дапаўняецца новымі запісамі. У Беларусі гэты працэс адбываецца марудна.

У 2006 г. хуткасць і якасць перадачы даных праз Інтэрнэт, а таксама яго агульнадаступнасць і маштабнасць спарадзілі з'яўленне сінтэтычнай разнавіднасці тэатральнай трансляцыі, якая спалучыла асновы экранных мастацтваў з паказам твораў на вялікім кінаэкране з дапамогай Інтэрнэту. Запушчаны праекты The Met: Live in HD, TheatreHD і інш., здольныя данесці да гледачоў з розных краін сучасныя тэатральныя работы ў высокай лічбавай якасці гуку і выявы. Пра перспектыўнасць падобных паказаў сведчыць вялікая папулярнасць гэтых праектаў ва ўсім свеце, у тым ліку ў Беларусі.

Можна выказаць меркаванне, што з улікам тэхнічнага прагрэсу праз некалькі гадоў з'явяцца іншыя спосабы і праекты для развіцця і рэпрэзентацыі тэатра, яшчэ больш высокатэхналагічныя. Трансляцыі, што адбываюцца ў нашы дні ў сістэме «тэатр – спадарожнік – Інтэрнэт – кінатэатр – глядач», цалкам адпавядаюць тэндэнцыям развіцця сучаснага мастацтва: спалучаюць розныя стылі, жанры і напрамкі. Інтэрнэт-тэатр, які з'явіўся ў пачатку XXI ст., за кароткі перыяд стаў распаўсюджанай з'явай, а значыць, тэатр пашырае межы функцыянавання.

*1.* Вечер с Игорем Ружейниковым. Театр на очень большом экране – TheatreHD [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://rutv.ru/brand/show/episode/1421344/viewtype/picture. – Дата доступа: 11.09.2016.

*2.* Театральный киносезон 2015/16: Опера [Электронный ресурс] // Theatrehd.ru. – 2013. – Режим доступа: http://www.theatrehd.ru/ru/projects/394. – Дата доступа: 11.09.2016.

*3. Трапянок, У. А.* Спецыфіка рэпрэзентацыі драматычных спектакляў у Інтэрнэце / У. А. Трапянок // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : Нацыянальная культура ў зменлівым свеце : матэрыялы IV Міжнар. завоч. навук.-практ. канф., Мінск, 24 снеж. 2015 г. / Ін-т культуры Беларусі. – Мінск, 2015. – С. 206–210.

*4.* Our Story [Electronic resource] // The Metropolitan Opera. – 2015. – Mode of access: http://www.metopera.org/About/The-Met/. – Date of access: 11.09.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. TheatreHD – легендарные спектакли на экранах кинотеатров [Электронный ресурс] // Artcorporation.by. – 2016. – Режим доступа: http://www.artcorporation.by/project/theatrehd/. – Дата доступа: 12.09.2016.

6. TheatreHD: сентябрь [Электронный ресурс] // УП «Киновидеопрокат» Мингорисполкома. – 2016. – Режим доступа: http://kinominska.by/news/347. – Дата доступа: 12.09.2016.

7. The Met: Live in HD [Электронный ресурс] // Википедия. – 2016. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/The Met: Live in HD. – Дата доступа: 07.09.2016.

8. The Met: Live in HD. [Электронный ресурс] // Coolconnections. – 2001–2016. – Режим доступа: http://www.coolconnections.ru/en/broadcast/2012. – Дата доступа: 13.09.2016.

*U. Trapianok*

**Internet Theatre and ways of its functioning in modern media space**

*The aim of the study is to identify the ways of the Internet Theatre functioning. The author gives the definition of the Internet Theatre, analyzes artistic and technical merits of performances, which are broadcasted via the Internet, and considers the peculiarities of the theatre art in a global network.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 13.03.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ